**УДК 097 (476.5-25) + 027.1(476)Глебка + [025.171 + 027.2](476)**

# ВЫДАННІ СА ШТАМПАМІ ЎСТАНОЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ ВІЦЕБСКА Ў КНІГАЗБОРЫ ПЯТРА ГЛЕБКІ

***В.В. СВЯКЛА***
**Цэнтральная навуковая бібліятка імя Я. Коласа НАН Беларусі, Мінск**

*Разглядаюцца выданні са штампамі ўстаноў і арганізацый Віцебска з кнігазбору беларускага пісьменніка і вучонага Пятра Глебкі (1905–1969), які захоўваецца ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.*

Гісторыя бібліятэк і кнігазбораў – гэта перш за ўсё гісторыя пастаянных міграцый кніг, якія іх складаюць. Таму важнае значэнне пры даследаванні кніжных калекцый мае вывучэнне правененцый – пазнак, якія паказваюць на прыналежнасць кнігі арганізацыі або прыватнай асобе (аўтарскія, уладальніцкія і дароўныя запісы, экслібрысы, суперэкслібрысы, пячаткі, штампы і інш.).

Асабісты кнігазбор пісьменніка, вучонага, грамадскага дзеяча акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Пятра Фёдаравіча Глебкі (1905–1969) – адна з найбольш значных прыватнаўладальніцкіх кніжных калекцый, што захоўваюцца ў фондах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Асабістая бібліятэка П. Глебкі, якая фарміравалася на працягу ўсяго жыцця ўладальніка, налічвае 3867 выданняў на беларускай, рускай, украінскай і іншых мовах, якія выйшлі ў 1804–1960-х гг. Кнігазбор паэта і вучонага мае ўніверсальна-гуманітарны характар. У ім шырока прадстаўлена мастацкая літаратура (кнігі беларускіх аўтараў, пісьменнікаў розных народаў СССР, замежных класікаў), выданні па гісторыі, філасофіі, рэлігіі, мовазнаўстве, мастацтвазнаўстве, літаратуразнаўстве, фалькларыстыцы[1].

П. Глебка папаўняў хатнюю бібліятэку самымі рознымі спосабамі: купляў кнігі ў кнігарнях, букіністычных крамах, атрымліваў у дар, прывозіў са шматлікіх паездак. Часта кнігі з калекцыі паэта маюць дароўныя надпісы, пазнакі былых уладальнікаў, па якіх можна прасачыць шлях выдання ў кнігазбор паэта.

Са з'яўленнем у 2015 г. каталога "Бібліятэка акадэміка П.Ф. Глебкі (1905–1969)"[2] магчымасці для вывучэння гісторыі камплектавання кнігазбору пісьменніка значна пашырыліся. У названым выданні побач з бібліяграфічнымі апісаннямі кніг прыводзяцца звесткі пра рознага роду пазнакі на іх. Інфармацыя пра штампы на кнігах з бібліятэкі П. Глебкі абагульнена ў "Паказальніку штампаў і ярлыкоў" [2, с. 418–422]. Гэты паказальнік сведчыць, што на старонках выданняў з бібліятэкі П. Глебкі сустракаецца каля ста штампаў і ярлыкоў, якія паказваюць на ранейшую прыналежнасць кніг розным установам і арганізацыям, а таксама прыватным асобам. 21 з іх належыць установам і арганізацыям Віцебска. Поўны алфавітны пералік штампаў устаноў Віцебска, якія сустракаюцца на кнігах з бібліятэкі П. Глебкі, падаецца ў Дадатку 1.

Штампы з геаграфічнай прывязкай да Віцебска выклікаюць цікавасць па некалькіх прычынах. Папершае, уражвае іх вялікая ўдзельная вага – каля 20% ад агульнай колькасці штампаў у кніжнай калекцыі П. Глебкі. "Віцебскіх" штампаў на выданнях з бібліятэкі П. Глебкі не менш, чым штампаў устаноў Мінска, дзе прайшла большая частка жыцця ўладальніка кнігазбору, і значна больш, чым штампаў устаноў любога з іншых гарадоў Беларусі, СССР і замежжа. Па-другое, у пераважнай большасці гэтыя штампы належаць дзяржаўным бібліятэкам, пры гэтым вельмі часта – бібліятэкам, якія былі дзеючымі амаль увесь той час, калі адбывалася фарміраванне кнігазбору П. Глебкі, і працягваюць дзейнічаць сёння. Між тым, аналіз штампаў на выданнях з кнігазбору П. Глебкі паказвае, што папаўненне гэтай калекцыі за кошт выданняў, якія мелі прыналежнасць да фондаў бібліятэчных устаноў, тым больш дзеючых, было з'явай хутчэй выпадковай, чым сістэмнай.

Усяго ў асабістай бібліятэцы П. Глебкі 33 кнігі са штампамі ўстаноў і арганізацый Віцебска. Сярод іх – выданні па гісторыі, псіхалогіі, філасофіі, рэлігіі, культуралогіі, антрапалогіі, зборнікі гістарычных дакументаў, мастацкая літаратура. Крайнія даты выдання для гэтай часткі кнігазбору пісьменніка – 1861–1919 гг. Усе без выключэння кнігі выдадзены на тэрыторыі Расійскай імперыі і Савецкай Расіі: у Санкт-Пецярбургу (Петраградзе), Маскве, Кіеве, Віцебску, Полацку, Вільні. Мова ўсіх выданняў руская, аднак пры гэтым сярод іх вялікая колькасць перакладаў твораў замежных аўтараў.

Усе выданні са штампамі ўстаноў і арганізацый Віцебска з кнігазбору П. Глебкі падаюцца ў Дадатку 2. Ён мае выгляд табліцы, у якой насупраць назваў кніг, размешчаных у алфавітным парадку, прыводзяцца нумары штампаў на іх згодна з іх парадкавай нумарацыяй у Дадатку 1.

Заўважым, што колькасць штампаў устаноў Віцебска на выданнях з кнігазбору П. Глебкі прыкметна большая, чым колькасць устаноў, якія гэтымі штампамі карысталіся. Тлумачыцца гэта тым,

[1] Больш падрабязна пра кнігазбор П. Глебкі гл. [2, с. 3–4 ], [6, 9].

што на працягу свайго існавання ўстановы і арганізацыі выкарыстоўвалі розныя штампы, у якіх адлюстроўвалася гісторыя іх перайменавання, змены ведамаснага падначалення ці прыналежнасці да пэўнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі і г.д. Пералічым установы Віцебска, штампы якіх сустракаюцца на выданнях з бібліятэкі П. Глебкі.

*Віцебская цэнтральная гарадская бібліятэка імя А.М. Горкага*[2]. У кнігазборы П. Глебкі 20 выданняў са штампамі гэтай бібліятэкі (№ 1, 9, 10, 14, 15)[3]. Храналагічныя межы паступлення ў бібліятэку кніг, у штампах якіх выкарыстоўваюцца скарачэнні ад слова "губернскі" (№ 9, 10, 14) – 1919–1924 г.[4] Штампы № 1, 15 нанесены на кнігі, хутчэй за ўсё, у 1919–1928 гг. (перыяд ужывання назвы "Дом кнігі" да прысваення бібліятэцы імя А.М. Горкага).

*Віцебская гарадская бібліятэка імя А.С. Пушкіна*[5]. У калекцыі П. Глебкі ўсяго адна кніга з пячаткай гэтай бібліятэкі (№ 16). Мяркуючы па арфаграфіі пячаткі, гэтая кніга трапіла ў фонд бібліятэкі да рэформы рускага правапісу 1918 г. У 1920-я гг. выданне апынулася ў фондзе Віцебскай Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя А.М. Горкага, аб чым сведчаць штампы гэтай установы.

*Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна*[6]. У кніжнай калекцыі П. Глебкі 4 выданні са штампам гэтай бібліятэкі (№ 2). Правапісныя асаблівасці беларускамоўнага штампа (напісанне падпарадкоўваецца правілам, якія дзейнічалі да рэформы беларускай арфаграфіі 1933 г.) дазваляюць сцвярджаць, што гэтыя кнігі паступілі ў Віцебскую абласную бібліятэку не пазней азначанай даты. Таксама бясспрэчна, што кнігі знаходзіліся ў фондзе бібліятэкі да 1937 г. ці нават да 1940 г. (кожная з іх мае штамп «Проверено 1937 г.» з надпісам "40" або "40 г" (?) на ім ці побач з ім). Характэрнай рысай выданняў са штампам гэтай бібліятэкі з'яўляецца тое, што яны не маюць правененцый іншых бібліятэк Віцебска.

*Бібліятэка Віцебскай губернскай гімназіі*[7]. Адзінае ў калецыі П. Глебкі выданне са штампам гэтай бібліятэкі (№ 5) пасля 1918 г. трапіла ў Віцебскую цэнтральную бібліятэку імя А.М. Горкага, пра што кажа штамп гэтай установы на ім.

*Віцебская цэнтральная навукова-педагагічная бібліятэка.* У працах па гісторыі бібліятэчнай справы Беларусі гэтая ўстанова згадваецца нячаста. Як сцвярджае І.Б. Сіманоўскі, на 1920 г. гэта была буйная бібліятэка, арганізаваная праўленнем прафсаюза работнікаў сацыялістычнай культуры [12, с. 204]. Згадка пра яе, якая адносіцца да 1921 г., ёсць у выданні "Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна 80 гадоў" [4, с. 10].

У калекцыі П. Глебкі 13 кніг са штампам гэтай бібліятэкі (№ 21), большасць з іх адначасова мае штампы Дома кнігі. Аналіз штампаў дае падставу сцвярджаць, што кнігі з навукова-педагагічнай бібліятэкі пераходзілі ў фонд Дома кнігі, а не наадварот, прычым у шэрагу выпадкаў гэта адбывалася не пазней як у 1924 г., яшчэ ў час існавання Віцебскай губерні. Дарэчы, менавіта 1924 г. стаў апошнім годам існавання аб'яднання, якое стварыла Віцебскую цэнтральную навукова-педагагічную бібліятэку, – Віцебскага губернскага аддзела Усерасійскага прафесійнага саюза работнікаў асветы [5, с. 499, 501]. Магчыма, ў гэты час скончылася і гісторыя самой бібліятэкі.

*Бібліятэка-чытальня рабочай моладзі камуністычнага саюза моладзі Віцебска.* Звестак аб гэтай бібліятэцы ў друку зусім няшмат. Вядома, што ў 1921 г. яна дзейнічала пры клубе імя К. Лібкнехта па вуліцы Смаленскай у Віцебску [4, с. 10]. Да фонду гэтай бібліятэкі належала толькі адна кніга з кнігазбору П. Глебкі, пазначаная штампамі № 4, 20. Правененцыі іншых устаноў Віцебска на ёй адсутнічаюць.

*Віцебскі абласны краязнаўчы музей*[8]. П. Глебка быў уладальнікам усяго аднаго выдання з фондаў музея, якое пазначана двума рознымі штампамі (№ 3, 12). Разглядаючы штампы ў кантэксце гісторыі

[2] Дзеючая бібліятэка Віцебска. Заснавана ў 1919 г. як Дом кнігі. У 1928 г. атрымала імя А.М. Горкага, у 1949 г. – сучасную назву [3, с. 78–79].

[3] Тут і далей нумар штампа ў тэксце адпавядае яго парадкаваму нумару ў Дадатку 1.

[4] 10 сакавіка 1924 г. у сувязі з першым узбуйненнем БССР Віцебская губерня перастала існаваць як адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў складзе РСФСР.

[5] Найстарэйшая з усіх бібліятэк Віцебска, якія дзейнічаюць сёння. Адкрыта ў жніўні 1904 г. згодна з рашэннем Віцебскай гарадской думы ад 1899 г., прынятым ў сувязі са 100-годдзем з дня нараджэння А.С. Пушкіна [3, с. 77].

[6] Дзеючая бібліятэка Віцебска. Заснавана ў 1925 г. як філіял Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна. У 1938 г. пераўтворана ў Віцебскую абласную бібліятэку імя У.І. Леніна [3, с. 78].

[7] Створана ў 1794 г. пры народным вучылішчы ў Віцебску. З 1808 г. дзейнічала пры Віцебскай губернскай гімназіі (з 1831 г. Віцебская Аляксандраўская губернская гімназія – у гонар расійскага імператара Аляксандра I), у якую было рэарганізавана вучылішча. Спыніла дзейнасць у 1918 г. У апошнія гады свайго існавання была найбуйнейшым кнігазборам Віцебска [10, с. 37–39].

[8] Дзеючы музей Віцебска. Утвораны ў 1918 г. як Віцебскі губернскі музей аддзела народнай адукацыі выканаўчага камітэта Віцебскага губернскага Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. У 1924 г. на яго аснове створана Віцебскае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага музея, рэарганізаванае ў 1929 г. у Віцебскі дзяржаўны культурна-гістарычны музей. У 1932 г. перайменаваны ў Віцебскі дзяржаўны сацыяльна-гістарычны музей, у 1937 г. – у Віцебскі дзяржаўны гістарычны музей, у 1939 г. – у Віцебскі абласны дзяржаўны гістарычны музей. З 1947 г. – Віцебскі абласны гісторыка-краязнаўчы музей, з 1951 г. мае сучасную назву [5, с. 416–417].



PolotskSU

перайменаванняў установы, можна зрабіць выснову: першы з іх безумоўна адносіцца да перыяду 1924–1929 гг, другі належыць да храналагічнага адрэзка 1937–1939 гг., аднак не выключана, што гэты штамп мог выкарыстоўвацца і да 1941 г., калі дзейнасць музея прыпынілася ў сувязі з нямецка-фашысцкай акупацыяй Віцебска. Варта адзначыць, што кніга са штампамі музея не мае пазнак ніякіх іншых устаноў, хоць вядома, што менавіта кніжныя фонды Віцебскага аддзялення Дзяржаўнага музея Беларусі, разам з фондамі Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута і Інстытута народнай адукацыі, паслужылі базай для стварэння ў 1925 г. Віцебскага аддзялення Дзяржаўнай бібліятэкі БССР [3, с. 78].

*Віцебская губернская тыпаграфія*[9]. Адзіная ў бібліятэцы П. Глебкі кніга са штампам тыпаграфіі – надрукаванае ў ёй выданне "Полоцкая епархия к 1903 г." (складальнік Д.І. Даўгяла). Аднак найбольш прыкметнай правененцыяй гэтага выдання з'яўляецца не згаданы штамп, а аўтограф выдатнага віцебскага гісторыка, краязнаўца, археолага, даследчыка мінуўшчыны Віцебшчыны А.П. Сапунова. Не выключана, што кніга з'яўлялася ўласнасцю А.П. Сапунова да самай яго смерці ў 1924 г.[10], а ў перыяд 1925–1933 гг. трапіла ў Віцебскую абласную бібліятэку (тады яшчэ – аддзяленне Дзяржаўнай бібліятэкі БССР у Віцебску), пра што сведчыць штамп гэтай установы на выданні.

Звесткі пра ўстановы, якія карысталіся штампамі № 6, 13, 17–19, у літаратуры сустракаюцца вельмі рэдка, не вызначаюцца канкрэтнасцю або зусім адсутнічаюць. Аднак відавочна, што ўсе гэтыя штампы належалі ўстановам, дзейнасць якіх разгортвалася ў перыяд з 1917 г. да сярэдзіны 1920-х гг. Ні адзін з азначаных штампаў не сустракаецца больш як на трох кнігах з калекцыі П. Глебкі. Некаторыя з выданняў, пазначаных імі, пазней трапілі ў фонд віцебскага Дома кнігі.

Агульныя высновы, якія можна зрабіць на падставе аналізу штампаў устаноў і арганізацый Віцебска на выданнях з кнігазбору П. Глебкі, наступныя:

1) большая частка штампаў адносіцца да 1920-х (у меншай ступені 1930-х) гг. Менавіта другое дзесяцігоддзе ХХ ст. можна лічыць часам паступлення большасці кніг у бібліятэкі і іншыя ўстановы Віцебска;

2) шэраг кніг, акрамя штампаў устаноў і арганізацый Віцебска, мае штампы і рукапісныя пазнакі іншых уладальнікаў (арганізацый і прыватных асоб) і карыстальнікаў. Некаторыя з іх сведчаць аб тым, што асобныя выданні ў свой час з'яўляліся прыватнай уласнасцю жыхароў Віцебска (напрыклад, пячатка "Агентъ Витебскага Губерн. Взаимн. Земск. Страхования. Печать" на выданні "Памятная книжка Витебской губернии на 1909 год або згаданы вышэй аўтограф А.П. Сапунова на зборніку "Полоцкая епархия к 1903 году". Аднак сувязь большасці такіх кніжных пазнак (штампы "Ви[…] отдел агроном[…]","Политическ. Отдел. 5-й Стрелк. Див. Библиотека", "Район. Вечерняя Школа (?)", "[…] Отдельной стрелковой Бригады [Поход…] Клуб", "Библиотека Читальня им. Луначарского. Отделение Пролет. Клуба №", надпісы "Из книг Л.М. Маймина", "Гуревич", "[…]асільє[…]" і інш.) з Віцебскам не ўстаноўлена. У той жа час яе нельга выключаць. А вось пазнак на кнігах, якія б служылі доказам знаходжання выданняў за межамі Віцебска да іх уваходжання ў кнігазбор П. Глебкі, не зафіксавана ўвогуле;

3) штампы арганізацый, сувязь якіх з Віцебскам не ўстаноўлена, прыватных асоб, уладальніцкія і іншыя запісы не дазваляюць прасачыць лёс кніг у перыяд пачынаючы з другой паловы 1920-х гг. Запіс "Прочел всю Томшинский Колька Гуревич Фомка 16/X 24 г.» на адным з тамоў Збору твораў Ф.К. Салагуба 1914 года выдання – найпазнейшая з такога роду пазнак, многія з якіх увогуле недатаваныя. Не маюць даты і ўладальніцкія запісы П. Глебкі на "віцебскіх" кнігах.

Такім чынам, ні штампы ўстаноў і арганізацый Віцебска, ні пазнакі іншых арганізацый і асоб не даюць ніякіх доказаў таго, што ў 1940-я гг. і ў пазнейшы час азначаны кніжны масіў належаў віцебскім установам, і тым больш не дазваляюць адказаць на пытанне аб часе, умовах і прычынах страты імі гэтых кніг.

Знікненне азначаных кніг са сховішчаў віцебскіх бібліятэк магло адбыцца па цэлым шэрагу гістарычных прычын. Пералічым асноўныя з іх:

1) *абставіны часоў Вялікай Айчыннай вайны.* Падчас нямецка-фашысцкай акупацыі Віцебска 1941–1944 гг. буйнейшыя ўстановы культуры горада пацярпелі разбурэнні і значныя страты фондаў. У час вайны былі цалкам знішчаны будынак і кніжны фонд Віцебскай гарадской бібліятэкі імя А.С. Пушкіна, каля 100 тыс. адзінак захоўвання страціла Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна, больш за 250 тыс. тамоў – Віцебская Цэнтральная гарадская бібліятэка імя А.М. Горкага [3, с. 77–78]. 31% экспанатаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея таксама быў знішчаны акупантамі [3, с. 114]. Аднак

[9] Дзейнічала ў Віцебску ў 1797–1917 гг. Выдала больш за 250 назваў кніг, больш за 400 друкаваных выданняў. Друкавала афіцыйныя цыркуляры, "газету "Витебские губернские ведомости", "Памятные книжки Витебской губерниии" і інш. [3, с. 354].

[10] У апублікаваным Л. Хмяльніцкай спісе кніг з асабістай бібліятэкі А.П. Сапунова, якія засталіся пасля яго смерці, ёсць запіс "Довгялло. Полоцкая епархия" [13, с. 238]. Арыгінал гэтага спісу захоўваецца ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці [7, арк.66–70].



PolotskSU

вельмі верагодна, што выданні, якія лічыліся страчанымі ў ваенны час, у сапраўднасці працягвалі сваё існаванне і пазней сталі ўласнасцю П. Глебкі;

2) *чысткі бібліятэчных фондаў у 1920–1930-я гг. па ідэалагічных і палітычных прычынах.* Храналагічна, тэматычна, з пункту гледжання аўтарства і па некаторых іншых прычынах значная частка выданняў, прыведзеных у Дадатку 2, у азначаны перыяд магла быць прылічана да кніг, якія падлягалі ўключэнню ў фонды абмежаванага доступу (так званыя "спецхраны") або не падлягала захоўванню ў бібліятэках увогуле. Згодна з "Інструкцыяй аб перагляде кніжнага складу бібліятэк і выдаленню контррэвалюцыйнай і антымастацкай літаратуры" 1923 г. за подпісам старшыні Галоўнага палітыка-асветнага камітэта (Галоўпалітасветы) Народнага камісарыята асветы РСФСР Н.К. Крупскай, захоўванню ў бібліятэках не падлягала, у ліку іншага, літаратура наступных тыпаў: "патрыятычная, чарнасоценная, варожая перадавым ідэям", "гістарычная белетрыстыка, якая ідэалізуе мінулае, прыхарошвае самадзяржаўны лад", "рэлігійна-духоўная", "якая страціла цікавасць у цяперашні час"[11]. Згодна з гэтай інструкцыяй, пад рознага роду забароны і абмежаванні маглі трапіць многія "віцебскія" выданні з кнігазбору П. Глебкі: працы прыхільнікаў марксізма, погляд якіх на вучэнне К. Маркса быў адрозны ад погляду бальшавікоў і У.І. Леніна (К. Каўцкі, М.І. Туган-Бараноўскі), кніга І.Я. Забеліна аб побыце прадстаўнікоў рускага царызму, выданні па гісторыі рэлігіі і царквы А.П. Сапунова, Ф.М. Бяляўскага і іншых аўтараў, мастацкія творы ворага ідэй бальшавіцкай рэвалюцыі Ф.К. Салагуба і паэта сялянскай тэматыкі М.А. Клюева, неўзабаве пасля рэвалюцыі абвешчанага савецкай літаратурнай крытыкай ідэолагам кулацтва, літаратура па філасофіі[12]. А калі ўлічыць увогуле насцярожанае стаўленне цэнзуры да выданняў дарэвалюцыйнага часу (сярод 33 кніг іх 27) і кніг замежных аўтараў (прыблізна трэцяя частка ўсіх выданняў), то атрымліваецца, што ледзь не кожная з разгледжаных кніг магла ў 1920–1930-я гг. атрымаць забарону на ўключэнне ў асноўны бібліятэчны фонд. Кніг жа нейтральных з ідэалагічнага пункту гледжання сярод іх няшмат, а выданняў – выразных носьбітаў бальшавіцкай ідэалогіі няма зусім.

Разам з тым, можна прывесці і некалькі аргументаў супраць таго, што "віцебскія" выданні з кнігазбору П. Глебкі маглі належаць да бібліятэчных фондаў спецыяльнага захоўвання. Па-першае, ні на адной з іх няма адмысловых пазнак, якія б сведчылі пра гэта. Наадварот, частка выданняў мае штампы бібліятэчных аддзелаў выдачы, перасоўных бібліятэк, пралетарскіх клубаў, што кажа хутчэй аб тым, што кнігі выдаваліся досыць шырокаму колу чытачоў і без занадта строгіх абмежаванняў. Па-другое, інструкцыі аб захоўванні літаратуры ў бібліятэчных фондах абмежаванага доступу і кантроль за іх выкананнем на працягу ўсёй гісторыі савецкай бібліятэчнай цэнзуры былі надзвычай строгія, і таму кнігі мелі няшмат шанцаў "вызваліцца" са "спецхранаў" або пазбегнуць перапрацоўкі ў "спецмакулатуру" у парушэнне гэтых інструкцый;

3) *няздольнасць бібліятэк Віцебска 1-й паловы 1920-х гг. захоўваць усю наяўную літаратуру ў сувязі з фінансавымі, кадравымі, інфраструктурнымі цяжкасцямі.* Гэтую праблему закранае публікацыя ў газеце "Савецкая Беларусь" ад 6 лютага 1923 г. за подпісам "Алеся Гаротная"[13]. Аналізуючы стан бібліятэчнай справы на Віцебшчыне, аўтар піша: "Цікаў гэты пераход ад вялікага к малому: то бібліатэка (Дом кнігі – *В.С.*) мелася зьбіраць і ўсё выхадзячае з сучаснага друку і ўсё друкаванае на розных мовах і розных зьместаў – што знаходзілася-б на Вітабшчыне, то яна адмаўляецца ад гэтага і ня мае магчымасці зьмясціць у сваіх пакоях нават і таго кніжнага багацьця, якое сабрана ў Вітабску рознымі органамі асьветы, пачынаючы з 1917 г.; і вялікі лік кніжак з сабранага будзе адпраўлен на перапрацоўку на паперную фабрыку, як кнігі старыя і не падыходзячыя да сучаснага моманту"[14].

Аўтар публікацыі паведамляе толькі аб намеры Дома кнігі пазбавіцца ад часткі выданняў. Аднак не выключана, што скарачэнні фондаў віцебскіх бібліятэк па эканамічных і інфраструктурных прычынах у 1-й палове 1920-х гг. сапраўды ажыццяўляліся. А калі яны былі рэальнасцю, то можна выказаць меркаванне, што не ўсе кнігі, ад захавання якіх адмаўляліся бібліятэкі, чакаў лёс "папернай перапрацоўкі", аб якой згадвае Алеся Гаротная. Частка з іх магла захавацца і працягваць існаванне па-за межамі бібліятэчных фондаў.

Заўважым, аднак, што сказанае калі і датычыцца "віцебскіх" выданняў з бібліятэкі П. Глебкі, то ў не вельмі значнай ступені. Многія з іх належалі да фондаў бібліятэк Віцебска ў 2-й палове 1920-х гг., калі найбуйнейшыя бібліятэчныя ўстановы горада (перш за ўсё тыя бібліятэкі, якія дзейнічаюць у Віцебску да сённяшняга часу) пераадолелі праблемы, звязаныя з немагчымасцю захоўваць усе наяўныя кнігі і, наадварот, сталі ўзбагачаць свае фонды, у тым ліку і за кошт выданняў з іншых бібліятэк.

---

[11] Цыт. паводле: [11, с. 56].

[12] Прозвішчы рускіх дарэвалюцыйных і замежных філосафаў, творы якіх у 1920-я гг. належала выдаляць з бібліятэчных фондаў, называюцца ў артыкуле Б.В. Емяльянава [8, с. 191]. Сярод іх ёсць і аўтары "віцебскіх" кніг з бібліятэкі П. Глебкі (Д. Лок, М. Штырнер, Ф. Ніцшэ, Г.Спенсер).

[13] Псеўданім этнографа і мастацтвазнаўца А.А. Шлюбскага [1, с. 377].

[14] Цыт. паводле: [4, с. 10.].

Зрэшты, знікненне азначаных выданняў з фондаў бібліятэк і іншых устаноў і арганізацый Віцебска можа быць абумоўлена не пэўнымі гістарычнымі прычынамі, а тым фактам, што бібліятэчныя работнікі 1920–1930-х гг., у адрозненне ад іх калег у XXI ст., наўрад ці ўспрымалі гэтыя кнігі як рэдкія, каштоўныя выданні, якія належыць захоўваць у бібліятэках без усялякіх часавых абмежаванняў. Для тагачасных бібліятэкараў яны, хутчэй за ўсё, з’яўляліся выданнямі, якія маглі быць выдаленыя з фондаў па самых звычайных прычынах, такіх, напрыклад, як неактуальнасць зместу, нізкая запатрабаванасць, празмерная дублетнасць і г.д.

Нявысветленымі застаюцца і абставіны, пры якіх П. Глебка стаў уладальнікам кніг, якія некалі захоўваліся ў віцебскіх установах. Хутчэй за ўсё, пісьменнік не меў прамога дачынення да страты бібліятэкамі і іншымі ўстановамі горада часткі сваіх фондаў. Больш верагодна, што ён набыў іх у іншых асоб, мабыць, у пасляваенныя гады, калі П. Глебка быў ужо надзвычай дасведчаным бібліяфілам, які добра арыентаваўся на кніжным рынку, валодаў дастатковай інфармацыяй аб складзе тагачасных прыватных кніжных калекцый, меў стасункі з іх уладальнікамі.

ЛІТАРАТУРА


1. Беларускія пісьменнікі : бібліягр. слоўнік : у 6 т. / Ін-т літаратуры імя Я. Купалы АН Рэспублікі Беларусь, Беларус. Энцыклапедыя ; пад рэд. Мальдзіса ; рэдкал.: Э.І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1995. – Т. 6. Талалай – Яфімаў. Дадатак. – 684 с.
2. Бібліятэка акадэміка П.Ф. Глебкі (1905–1969): каталог выданняў: з фонду аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр. навук. б-ка імя Якуба Коласа; склад.: А.В.Сцефановіч [і інш.] ; рэдкал.: А.І. Груша (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 423 с., [62] с. іл.
3. Витебск: энцикл. справ. / Белорус. Сов. Энцикл. ; редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелСЭ, 1988. – 408 с., [12] л. іл.
4. Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна 80 гадоў / Склад. Л.С. Гудзелева; рэдкал.: А.І. Сёмкін, [і інш.]. – Наваполацк : А.У. Маладечкін, 2009. – 108 с.
5. Государственный архив Витебской области: путеводитель, 1917–2006 / Сост. Т.В. Буевич, Ю.С. Петухов: редкол.: Т.М. Свистунова (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Медисонт, 2011. – 936 с.
6. Губанава, В.А. Бібліятэка П.Ф. Глебкі ў фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі / В.А. Губанава // Библиотеки в информационном пространстве: синтез традиций и инноваций : материалы Междунар. науч.-практ. Конф. молодых ученых и специалистов, Минск, 12 сент. 2007 г. : сб. научных статей. – Минск : Красико-Принт, 2007. – С. 197–206.
7. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 1947. Воп.1. Спр. 11.
8. Емельянов, Б.В. Философия специального хранения: факты и комментарии / Б.В. Емельянов // Известия Уральского федерального университета. Сер. 1, Проблемы образования, науки и культуры. – 2015. – № 3 (141). – С. 188–195.
9. Іванова, Г. І кнігі, і архіў ён завяшчаў народу / Г. Іванова, Я. Кісялёва // Навіны Акадэміі навук Беларусі. – 1995. – № 29. – 27 ліп. – С. 2–3.
10. Подлипский, А. Книга в Витебске: (Книгоиздательство, библиотеки и книголюбы Витебска): Дооктябрьский период / А.М. Подлипский. – Витебск : Витебская областная типография, 1999. – 64 с.
11. Рассамахин, Ю.К. Центральная городская библиотека им. А.С. Пушкина. Централизация под крышей Политпроса (1920 – 1940 гг.) / Ю.К. Рассамахин // Томская областная универсальная научная библиотека им. А.С. Пушкина : очерки истории / под ред. Н.М. Барабанщикова ; под ред. С.С. Быкова ; авт. предислов. В.М. Костин. – Томск : Ветер, 2010. – С.47–57.
12. Симановский, И.Б. Развитие библиотечного дела в БССР, его итоги и перспективы к 40-летию Великой Октябрьской социалистической революции / И.Б. Симановский // 40 лет библиотечного строительства в СССР : доклады науч. конф. 23–26 дек. 1957 г. / Министерство культуры РСФСР ; Гос. б-ка СССР им. В.И. Ленина ; под ред. Ф.С.Абрикосовой. – Москва : [Б.и.], 1958. – 287 с.
13. Хмяльніцкая, Л. Гісторык з Віцебска (жыццяпіс Аляксея Сапунова) / Л. Хмяльніцкая. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2001. –256 с. – (Бібліятэка часопіса “Беларускі гістарычны агляд”. Серыя “Постаці”).


ДАДАТАК 1

**ШТАМПЫ ЎСТАНОЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ ВІЦЕБСКА НА ВЫДАННЯХ З КНІГАЗБОРУ П. ГЛЕБКІ**

1. Аддзел выдачы Дому кнігі
2. Беларуская Дзяржаўная Бібліотэка. Віцебскае Аддзяленьне
3. Беларускі Дзяржаўны Музей. Віцебск. Аддзяленьне
4. Библиотека-читальня рабоч. Молодежи. Российский Коммунист. Союз Молодежи г. Витебск
5. Библиотеки Витебской губернской гимназіи
6. Витеб. Уездн. Отдел. Народн. Образован. Центральн. Библиотека
7. Витеб. Центр. Библиотека. Гор. Отд. Нар. Обр.
8. Витебск. Городск. Отд. Народн. Образования. 1-я район. вечерн. школа для взросл.
9. Витебск. Губполитпросвет. Дом книги. Отдел выдач



Polotsksu

10. Витебск. Губполитпросвет. Дом книги. Читальня
11. Витебская губернская типографія
12. Віц. Дз. Гіст. Музей. Бібліатэка
13. Городская Центральная База Передвижн. Библиотек Витгубполитпроса
14. Губполитпросвет. Витгубоно. Дом книги
15. Дом книги
16. Печать Городской имени А. С. Пушкина библіотеки
17. Пролетарскій Клубъ 1-го мая, 1919 г. № 92 Витебск Уг. Биржевой и Смоленской ул.
18. Пролетарскій Клубъ 1-го мая. Витебскъ. Печать
19. Районная библиотека Политпросв. Витгубвоенн.
20. Союз Коммунистической молодежи г. Витебск
21. Центральная Научно-Педагогическая библиотека. Витебский Губернский отдел Всеросс. Союза работников Просвещения и Соц[…] культуры

ДАДАТАК 2

## ВЫДАННІ СА ШТАМПАМІ ЎСТАНОЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ ВІЦЕБСКА Ў КНІГАЗБОРЫ П. ГЛЕБКІ

| Назва кнігі | Нумары штампаў |
|---|---|
| Анненский, И.Ф. Книга отражений. – СПб., 1906. | 4, 20 |
| Бальцер, О. К истории общественно-государственного строя Польши: пер. с польского. – СПб., 1908. | 7, 15, 21 |
| Белявский, Ф. Ислам и культура арабов: популярный очерк. – СПб.; М., 1913. | 10, 15 |
| Богданов, А. Новый мир. – Изд. 2-е, доп. – М., 1918. | 17 |
| Вундт, В. Основы физиологической психологии. Т. 3, гл. 18/21. – СПб., [между 1870 и 1890?]. | 6, 15, 21 |
| [Доклады Витебской Губернской Земской Управы II очередному Губернскому Земскому Собранию 1913 г. и Журналы II очередного Губернского Земского Собрания по агрономическому отделу]. – [Б.м., 1913]. | 15 |
| Древне-русский город Слуцк и его святыни: исторический очерк с шестью гравюрами / сост. А.А. Серно-Соловьевич. – Вильна, 1896. | 2 |
| Забелин, Е.И. Домашний быт русских цариц в XVI–XVII ст. Т. 2. – 2-е изд. с доп. – М., 1872. | 15, 21 |
| Зорин, Н. Минувшее и настоящее г. Полоцка: к торжеству перенесения мощей пр. Ефросинии из Киева в Полоцк: краткий исторический очерк. – Полоцк, 1910. | 3, 12 |
| Историко-статистическое описание Минской епархии / составлено архимандритом Николаем. – СПб., 1864. | 2 |
| Каутский, К. Очерки и этюды по политической экономии : пер. с немецкого. – Петроград, 1918. | 13 |
| Клодд, Э. Картина мира; Детство человечества; Пионеры эволюции в XIX столетии / пер. с английского Д. Коропчевского, А. Николаева, А. Погодина.– СПб, 1898. | 10 |
| Клюев, Н. Медный кит : стихи. – [Петроград], 1919. | 13, 18 |
| Лавров, П.Л. Собрание сочинений Петра Лавровича Лаврова. Серия 1, вып. 2. Статьи по философии – Петроград, 1917. | 21 |
| Локк, Д. Мысли о воспитании и о воспитании разума / пер. с английского М. Энгельгардта; введение, примеч. Э Даниэля. – СПб., 1913. | 6, 21 |
| Негри, А. Стихотворения / пер. с итальянского В. Шулятикова, предисл. В. М. Фриче. – Б.м., 1919. | 1, 21 |
| Ницше, Ф.В. Автобиография (esse homo) / пер. с немецкого, под ред., с предисл. Ю.М. Антоновского. – СПб., 1911. | 15, 21 |
| Памятная книжка Витебской губернии на 1909 год. – Витебск, 1909. | 15 |
| Петискус, А. Г. Олимп, или греческая и римская мифология в связи с египетской, германской и индийской: книга для взрослого юношества, молодых художников и для высших учебных заведений; пер. [с немецкого] П. Евстафиева. – СПб., 1861. | 5, 21 |
| Полоцкая епархия к 1903 году / сост. Д. И. Довгялло. – Витебск, 1903. | 2, 11 |
| Радлов, Э. Этика Аристотеля: пер. с греческого. – СПб., 1908. | 10, 15 |
| Романов, Е.Р. Белорусский сборник. Т. 1. Губерния Могилевская. Вып. 1/2. Песни, пословицы, загадки. – Киев, 1886. | 10, 15, 16 |
| Сапунов, А.П. Очерк исторических судеб православия и русской народности в Белоруссии вообще и пределах Полоцкой епархии в частности: произнесено на торжественном заседании Братства в день положения св. мощей Преподобной Евфросинии, Княжны Полоцкой в основанном Ею храме 23-го мая 1910 года. – Витебск, 1910. | 2 |
| Сологуб, Ф.К. Собрание сочинений. [В 20 т.]. – Т. 5. Восхождения: стихи. – СПб., 1913. | 1, 9, 21 |

Polotsk SU

| | |
|---|---|
| Сологуб, Ф.К. Собрание сочинений. [В 20 т.]. Т. 9. Змеиные очи: стихи. – СПб., 1914. | 1 |
| Сологуб, Ф.К. Собрание сочинений. [В 20 т.]. Т. 17. Очарования земли: стихи 1913 года. – СПб., 1914. | 1, 7 |
| Спенсер, Г. Справедливость / пер. с английского под ред. М. Филиппова. – СПб., 1897. | 10, 17, 21 |
| Суриков, И.З. Стихотворения. – Петербург, 1919. | 21 |
| Туган-Барановский, М.И. Теоретические основы марксизма. – 4-е изд. – М., 1918. | 7, 15, 21 |
| Фрейд, З. Психоанализ детского страха. (Анализ фобии 5-летнего мальчика) / авторизованный пер. [с немецкого]. – М.. 1913. | 15, 21 |
| Штирнер, М. Единственный и его собственность / пер. [с немецкого] Г. Федера. – СПб., 1907. | 8, 14, 15 |
| Штундисты. Постники. Свободные христиане. Духовные скопцы. Старообрядцы. – СПб., 1910. – (Материалы к истории и изучению русского сектанства и старообрядчества / под ред. В. Бонч-Бруевича; вып. 3). | 10, 15, 19 |
| Якушкин, И.Д. Записки И.Д. Якушкина. – Изд. 3-е., без перемен. – СПб., 1905. | 15, 21 |

## BOOKS WITH THE STAMPS OF VITEBSK INSTITUTIONS IN THE BOOK COLLECTION OF PYATRO HLEBKA

***V. SVYAKLA***

*The article reviews book exemplars with the stamps of Vitebsk institutions from the book collection of Belarusian writer and scientist Pyatro Hlebka (1905–1969), that resides in the Department of Rare Books and Manuscripts of the Yakub Kolas Central Science Library of National Academy of Sciences of Belarus.*

PolotskSU